Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 ЖНІЎНЯ 2009 г. ЧАЦВЕР № 155 (26513)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## ЖНІВО - 2009




Рыгор ВАСІЛЕВІЧ:

## «МЫ ПРАЦЯГВАЕМ ШУКАЦЬ ВАРЫЯНТЫ БОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНАГА ЎЗДЗЕЯННЯ НА П'ЯНЫХ КІРОЎЦАЎ»

**Генеральны пракурор Беларусі выказаў свой погляд наконт найвышэйшай меры пакарання, акрэсліў асноўную прычыну рэцыдыўнай злачыннасці, агучыў суму штрафаў, спагнаную з п'яных кіроўцаў за першае паўгоддзе 2009 года...**

### Пра смяротнае пакаранне

Рыгор Васілевіч выступае за прымяненне смяротнага пакарання ў дачыненні да асобаў, якія ўчынілі асабліва цяжкія забойствы. Паводле яго слоў, «гэта мера суровая, але справядлівая». Да слова, сёлета найвышэйшая мера пакарання прымянялася двойчы. Прысуд аб смяротным пакаранні быў вынесены ў дачыненні да забойцы сямі пажылых жанчын у Драгічынскім раёне і ў дачыненні да забойцы двух супрацоўнікаў сельгаспрадпрыемства Салігорскага раёна з мэтай завалодаць грашыма.

### Пра рэцыдывістаў

Каля 40 % раней судзімых асобаў паўторна парушаюць нормы закона (на рахунку вялікай колькасці з іх асабліва цяжкія злачынствы). Такі дастаткова высокі паказчык рэцыдыўнай злачыннасці, паводле слоў генеральнага пракурора, сведчыць пра тое, што папраўчыя калоніі замест таго, каб ставіць злачынцу на правільны шлях, пакуль выконваюць выключна функцыю ізаляцыі. «Неабходна як мага хутчэй мяняць сістэму ацэнкі работы папраўчых устаноў, — лічыць Рыгор Васілевіч. — Крытэрыем эфектыўнасці работы калоній павінна быць не колькасць выпушчаных на волю людзей, а колькасць асобаў, якія вярнуліся ў месца пазбаўлення волі. Чым менш іх вернецца, тым лепш. Бо перш чым вярнуцца ў калонію, раней судзімы пазбавіць некага маёмасці ці, горш за тое, жыцця, учыніць іншыя злачынствы».

### Пра нецвярозых кіроўцаў

Калі ў 2007 годзе з кіроўцаў, якія кіравалі транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення, у якасці штрафаў спагналі каля Br800 млн, то сёлета гэта сума склала каля Br12 млрд. Паводле слоў генеральнага пракурора, дасягнуць такіх паказчыкаў атрымалася ў тым ліку і дзякуючы намаганням органаў пракуратуры, якія ініцыявалі ўзмацненне меры адказнасці да 1000 базавых велічыняў. «Нецвярозымі за руль садзяцца не толькі мужчыны, але і жанчыны, — адзначыў Рыгор Васілевіч. — Шмат прыкладаў, калі падобныя парушэнні здзяйсняліся неаднаразова. Мы працягваем шукаць варыянты больш эфектыўнага ўздзеяння на п'яных кіроўцаў».

### Пра абрабаванні банкаматаў

Выпадкі абрабавання абменных пунктаў і банкаматаў генеральны пракурор назваў «міні-эпідэміяй»: гэта не больш чым гучныя справы, бо ў агульнай структуры злачынстваў яны не дамінуюць. Значная частка банкаматаў у Беларусі знаходзіцца ў так званых «цёмных кутках», не абсталявана сістэмай відэаназірання. Гэта толькі на руку злачынцам. «Яшчэ вясной мы патрабавалі ад банкаў, каб яны выдзелілі грошы на відэаапаратуру, а банкаматы і абменныя пункты перанеслі ў больш людныя месцы. Але пакуль зрухаў не бачым. Прычына ў тым, што многія банкі лічаць, што ім больш выгадна заплаціць страхоўку, чым набыць сістэму відэаназірання» Рыгор Васілевіч адзначыў, што гэта памылковы падыход. Тут, на яго погляд, недапрацоўваюць і страхавыя кампаніі.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## ПАСЛЯ АЗДАРАЎЛЕННЯ — У КАРАНЦІН?

### *Санэпідслужба інфармацыю пра грып A/H1N1 не хавае*

**Пасля 23 жніўня ў Беларусь з замежжа вяртаюцца больш як 13 тысяч дзяцей, якія праходзілі там аздараўленне. Усіх іх чакае сямідзённы каранцін — яны не змогуць наведваць арганізаваныя дзіцячыя калектывы, пакуль медыкі канчаткова не пераканаюцца ў тым, што дзеці не былі інфіцыраваны падчас адпачынку высокапатагенным вірусам грыпу A /H1N1. Абавязковыя медыцынскія агляды чакаюць і студэнтаў пры іх засяленні ў інтэрнаты, асабліва гэта датычыцца замежных грамадзян, якія навучаюцца ў Беларусі.**

— Па стане на 18 жніўня ў Беларусі не было лабараторна пацверджана ні аднаго выпадку захворвання грыпам A/H1N1, — паведаміла ўчора на сустрэчы з журналістамі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Рэспублікі Беларусь Валянціна КАЧАН.** — Аднак мы добра разумеем, што ізаляваць Беларусь ад пранікнення вірусу, які паспеў адзначыцца ўжо ў 156 краінах свету, у тым ліку ў краінах, з якімі мяжуе Беларусь, немагчыма. Гэта прыкладна тое ж, што адмяніць усход ці захад сонца. Але мы прымаем усе меры па недапушчэнні распаўсюджвання гэтага вірусу на нашай тэрыторыі. І мы вельмі ўдзячныя Міністэрству адукацыі за інфармацыю, якая была нам прадастаўлена літаральна на кожнае дзіця, якое праходзіла гэтым летам аздараўленне за межамі Беларусі, а гэта, між іншым, 23 тысячы дзяцей. Пераважная большасць з іх вяртаюцца на радзіму ў 20-х лічбах жніўня. Сярод краін, якія выклікаюць у нас асаблівую трывогу па колькасці захварэлых там на новы грып, хацелася б адзначыць Італію, Вялікабрытанію, Германію, Іспанію, Ірландыю, Бельгію і Аўстрыю.

Адказваючы на пытанні журналістаў, якія цікавіліся, чым мог быць выкліканы недавер з боку расійскіх калег наконт адсутнасці захварэлых на грып A/ H1N1 сярод беларусаў, Валянціна Качан паведаміла, што ў Беларусі ў поўным аб'ёме ажыццяўляюцца тыя ж супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы, што і ў Расіі, і наша краіна ў поўным аб'ёме забяспечана ўсім неабходным для своечасовай лабараторнай дыягностыкі. «Мы звяртаемся да лабараторнай дыягностыкі абсалютна ва ўсіх выпадках, калі ёсць падазрэнне, што чалавек мог быць інфіцыраваны высокапатагенным вірусам грыпу. Усяго з пачатку ўвядзення маніторынгу за станам здароўя пасажыраў, якія прыбываюць у нашу краіну авіятранспартам з небяспечных у эпідэмічным плане краін, было агледжана ўжо больш як 2304 рэйсы і каля 200 тысяч чалавек (пасажыраў і членаў экіпажа). Да таго ж усе нашы пагранічныя пераходы і ў аэрапортах, і на аўтадарогах, і на чыгунцы абсталяваныя бескантактнымі прыборамі для вымярэння тэмпературы цела. А ў дзяцей, якія вяртаюцца з замежжа, тэмпература абавязкова вымяраецца яшчэ і кантактным спосабам. І, хачу запэўніць, што ў выпадку выяўлення заражэння грыпам A/H1N1 сродкі масавай інфармацыі адразу ж будуць пра гэта праінфармаваныя. Не ў нашых інтарэсах хаваць ад людзей такую важную інфармацыю...»

Валянціна Качан заклікала ўсіх беларусаў, якія вяртаюцца з замежнага адпачынку, быць асабліва пільнымі, каб не прапусціць небяспечную хваробу. Інкубацыйны перыяд захворвання грыпам A/H1N1 складае 7 дзён. І калі на працягу тыдня пасля вяртання на радзіму ў чалавека з'яўляюцца сімптомы вострага рэспіраторнага віруснага захворвання, ні ў якім разе нельга займацца самалячэннем. Самастойна адрозніць звычайны сезонны грып ці нейкае іншае прастуднае захворванне ад грыпу A/H1N1 немагчыма. І для «звычайнага», і для новага грыпу характэрныя адны і тыя ж сімптомы: гэта павышэнне тэмпературы цела, галаўны боль, боль у мышцах, боль у горле і насмарк. Таму абавязкова трэба звярнуцца да ўрача і праінфармаваць спецыяліста аб сваёй замежнай вандроўцы...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Пятра ФАМІНА.

***Літаральна праз некалькі гадзін пасля завяршэння прэс-канферэнцыі з Міністэрства аховы здароўя прыйшло паведамленне аб выяўленні першага факта захворвання на грып A/H1N1 на тэрыторыі Беларусі. Захварэлы з'яўляецца грамадзянінам КНР. 10 жніўня ён прыехаў у Беларусь з Кітая. Былі выяўлены таксама ўсе, хто ўваходзіў у кантакт з захварэлым (37 чалавек). Медыцынскі агляд гэтых людзей і лабараторныя даследаванні дазваляюць сцвярджаць, што ніхто з іх не быў інфіцыраваны. Эпідэміялагічная сітуацыя знаходзіцца пад кантролем.***

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### РАДЫЯЦЫЙНЫЯ ЧАРНІЦЫ

**Чарніцы, сабраныя ў Слаўгарадскім раёне, перавысілі рэгламентаваную норму радыеактыўнага цэзію ў 20(!) разоў.**

Паводле слоў спецыялістаў па радыяцыйным кантролі Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, гэта была найбольш забруджаная на радыенукліды проба чарніцаў у рэгіёне.

Сёлета ў лабараторыі цэнтра праверана болей за 130 пробаў чарніцаў. Болей за тры дзясяткі з іх былі «бруднымі». На працягу апошніх гадоў перавышаюць дапушчальныя нормы 20—30 % праверанных пробаў не толькі ягад, але і грыбоў. Такія дары лесу непрыдатныя для ўжывання, а часам і вельмі небяспечныя для здароўя.

Цяпер пачаўся грыбны сезон: спецыялісты заклікаюць людзей быць асцярожнымі і абавязкова рабіць радыеметрычны кантроль грыбоў, сабраных на пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы тэрыторыях.

**Ілона ІВАНОВА.**

### 16-ГАДОВЫ ПАДЛЕТАК ЗАГІНУЎ У МАШЫНЕ СВАІХ БАЦЬКОЎ

**Трагедыя адбылася каля трох гадзін ночы ў Жлобінскім раёне.**

— Хлопец употай узяў ключы ад бацькоўскага аўтамабіля «Фальксваген-Пасат», на якім адправіўся пакатацца з сябрам, — расказвае начальнік аддзела агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама Марыя КРЫВАНОГАВА. — На 27-м кіламетры аўтадарогі Чырвоны Бераг—Ратуша хлопец не справіўся з кіраваннем. У выніку машына перакулілася і з'ехала ў кювет. Кіроўца загінуў, а яго 17-гадовы пасажыр цяпер з цяжкімі траўмамі знаходзіцца ў бальніцы.

Абодва падлеткі не былі прышпілены рамянямі бяспекі, якія, можна меркаваць, маглі б змякчыць наступствы трагедыі.

**Надзея ДРЫЛА.**

### ТОЛЬКІ АДЗІН ПАРЫЎ ВЕТРУ



120 лістоў шыферу з даху малочна-таварнай фермы было знесена адным парывам ветру днём ў вёсцы Енцы Карманскага раёна. Каровы ў гэты час былі ў полі, таму не пацярпелі ад стыхіі. Як паведамілі ў прэс-службе абласнога МНС, цяпер ідзе тэрміновы рамонт цаглянага памяшкання для жывёлы, якое было пабудавана амаль 25 гадоў таму. Страты падлічваюцца спецыяльнай камісіяй, папярэдне называецца лічба ў 4 мільёны рублёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## «ГАРАЧЫ» 287 17 41

## НЕ ПЛАЦІЦЬ ЗА ВАДУ НА ПАЛІЎ АГАРОДАЎ ПАДЧАС ДАЖДЖОЎ МОЖНА БЫЛО. НАПІСАЎШЫ ЗАЯВУ

**«Адкажыце, калі ласка, чаму, калі нашы агароды ўжо працяглы час залітыя вадой, больш за тое — фітафтора паспела «з'есці» і памідоры, і бульбу, з нас патрабуюць плату за паліў?» З такім пытаннем-скаргай на «гарачую лінію» газеты звярнуліся жыхары вуліц Школьнай і Заводскай, што ў пасёлку Міханавічы Мінскага раёна. Праблема, паводле слоў заяўнікаў, пачалася не ўчора — «паспрыялі» яшчэ ранейшыя дажджы, апошнія толькі давяршылі справу: на глеістых глебах вільгаць «прапісалася» надоўга. «А нам дасылаюць квітанцыі на аплату вады. Тэлефанавалі мы ў камунальную службу, даводзілі ім, што няма патрэбы ў паліве, аднак нічога не змянілася. Больш за тое, за кожны наступны летні месяц бяруць усё больш грошай. За ліпень, напрыклад, выйшла больш за 15 тысяч рублёў. Дык, можа, яшчэ і за жнівень прымусяць заплаціць? Мы ж вадой не карыстаемся!» Далей вяскоўцы ўзнялі і пытанне наконт усталявання лічыльнікаў-вадамераў. «Мы ж не супраць, гатовыя іх усталяваць. Але як? Карыстаемся мы калонкай, якая знаходзіцца на вуліцы. Як летам, дык яшчэ ўсё зразумела, а зімой? Той жа лічыльнік замерзне і выйдзе са строю!»**

Каб разабрацца ў сітуацыі, мы мусілі звярнуцца да спецыялістаў КУП «ЖКГ Мінскага раёна». Забягаючы наперад, можам сказаць, што па ўзнятых пытаннях усё аказалася не так адназначна. У прыватнасці, далёка не ва ўсім маюць рацыю і нашы заяўнікі.

— Мінскі абласны выканаўчы камітэт зацвердзіў нормы спажывання вады для паліваў агародаў, прычым, з улікам кліматычных умоў таго ці іншага месяца.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЭКАНАМІСТ З МВФ АБВЯСЦІЎ АБ ПАЧАТКУ ЎЗНАЎЛЕННЯ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ...

**Галоўны эканаміст Міжнароднага валютнага фонду Аліўе Бланшар лічыць, што выхад сусветнай эканомікі з рэцэсіі пачаўся.**

Тым не менш, па словах Бланшара, узнаўленне эканомікі свету стане няпростай задачай і запатрабуе часу. Уплыў крызісу на стане эканомікі будзе адбівацца яшчэ доўгія гады. Раней у МВФ прагназавалі, што паступовае ўзнаўленне глабальнай эканомікі адбудзецца не раней чым у 2010 годзе.

Нагадаем, на пачатку жніўня пра выхад з рэцэсіі абвясцілі ўрады Японіі, Германіі, Францыі і Ганконга.

### ...А УОРЭН БАФЕТ ПРЫСТРАШЫЎ ЗША АБВАЛАМ ДОЛАРА



**Найбагацейшы чалавек свету інвестар Уорэн Бафет папярэдзіў аб пагрозе збяднення грамадзян ЗША і рэзкага зніжэння пакупной здольнасці долара з-за масавых дзяржаўных запазычанняў і друкавання грошай. Пра гэта ён напісаў у сваёй калонцы ў The New York Times.**

Інвестар адзначыў, што фінансавая дапамога эканоміцы стала магчымай за кошт эмісіі пазыковых абавязацельстваў амерыканскай дзяржавы. Аднак бюджэтны дэфіцыт беспрэцэдэнтных памераў (1,8 трыльёна долараў) гэтыя сродкі могуць пакрыць толькі напалову. Астатняе давядзецца проста надрукаваць Федэральнай рэзервовай сістэме.

Паводле ацэнак Бафета, «чысты» дзяржаўны доўг у 2009 годзе ўзляціць на 15 працэнтных пунктаў ад ВУП. Інвестар адзначыў, што ў росце доўгу няма нічога дрэннага, калі ён павялічваецца прапарцыйна памеру актываў дзяржавы, карпарацый і грамадзян. Аднак калі доўг расце значна хутчэй, як гэта адбываецца цяпер, ЗША могуць ператварыцца ў «бананавую рэспубліку».

### З ГЕРМАНІІ Ў ПОЛЬШЧУ БУДЗЕ ХАДЗІЦЬ ТРАМВАЙ

**Франкфурт-на-Одэры і польскі горад Слубіце, размешчаны па іншы бок нямецка-польскай мяжы, звяжуць трамвайным маршрутам.**

Прадстаўнікі сумеснай нямецка-польскай камісіі ўжо замовілі распрацоўку праекта трамвайнай лініі, якая можа ўступіць у эксплуатацыю праз тры гады, паведамляе Tagesspiegel.

### МІШЭЛЬ АБАМА РАТУЕ ПАПУЛЯРНАСЦЬ МУЖА ШОРТАМІ

**Жонка прэзідэнта ЗША Мішэль Абама ў чарговы раз прымусіла амерыканцаў гаварыць пра сябе. Эксперты ўпэўненыя, што Мішэль — майстар адцягваць увагу суайчыннікаў ад крытыкі дзейнасці свайго мужа на дзяржаўнай ніве.**

Што б ні рабіла першая лэдзі, усё становіцца прадметам для падрабязнага абмеркавання — так, бурную палеміку выклікалі праца Мішэль на агародзе перад Белым домам, дыета яе дочак, паход прэзідэнцкай пары ў тэатр на Брадвеі. Гэтым разам Мішэль апынулася пад прыцэлам камер, выйшаўшы з Air Force One у кароткіх блакітных шортах. Амерыканцы, якім да гэтага не даводзілася бачыць жонак прэзідэнтаў у такім вельмі фрывольным адзенні, кінуліся абмяркоўваць гэты факт. Паводле праведзенага апытання, 57 % амерыканцаў у захапленні ад выгляду аголеных ног Мішэль. Паводле меркавання італьянскай газеты La Repubblica, кожны свой крок Мішэль дбайна прадумвае, і гэтае з'яўленне ў шортах таксама было невыпадковым. Бо ў канцы мінулага тыдня стала вядома, што рэйтынг Барака Абамы апусціўся яшчэ на 7 % — цяпер дзеянні прэзідэнта падтрымліваюць усяго 47 % суграмадзян.

# ВЯРНУЦЬ ЗЯМЛІ ЯЕ СІЛУ

### *У Беларусі распрацоўваецца Нацыянальная праграма барацьбы з дэградацыяй земляў*

Што пакінем пасля сябе?

**Надзённасць гэтай праблемы асэнсавалі не толькі вучоныя, эколагі, але і кіраўнікі, і простыя людзі. Ужо сёння зямля сігналізуе: час рабіць тэрміновыя захады па выпраўленні памылак, якія зрабіў чалавек, выкарыстоўваючы зямлю ў сваіх інтарэсах. З твару нашых ландшафтаў знікаюць тарфянікі, калісьці ўрадлівыя глебы пераўтвараюцца ў пясок, над краінай праносяцца пылавыя буры, смерчы, небывалыя ліўні... Гэта праблема не толькі Беларусі. І гэта не толькі адна асобная праблема. Дэградацыя зямель — бяда планетарнага маштабу, і яна звязана з іншымі глабальнымі экалагічнымі праблемамі чалавецтва. Вырашаць іх магчыма толькі агульнымі намаганнямі.**

**Напачатку жніўня ў Гарадку Віцебскай вобласці ў рамках рэалізацыі праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь» адбыўся рэгіянальны семінар «Ахова земляў/глебаў ад эрозіі і яе адлюстраванне ў Нацыянальнай праграме дзеянняў Рэспублікі Беларусь па барацьбе з дэградацыяй земляў». Пра тое, што хаваецца за гэтымі «разумнымі» словамі і якім чынам гэта датычыцца выпрабаванняў, якія нам наладжвае прырода, мы распыталі кіраўніка экспертнай групы праекта ЕС-ПРААН Валянціна ЯЦУХНУ.**

**— Чаму тэма барацьбы з дэградацыяй земляў для нас цікавая?**

— Таму што зямельныя рэсурсы — нацыянальны набытак Беларусі. Яны выкарыстоўваюцца ў розных сектарах эканомікі. І, натуральна, у найбольшай ступені — у аграрным. Сёння прыкладна 45 працэнтаў тэрыторыі Беларусі — сельскагаспадарчыя ўгоддзі. З іх прыкладна трыццаць працэнтаў — паша, якая выкарыстоўваецца найбольш інтэнсіўна.

З прававога пункту погляду зямельныя рэсурсы — гэта нерухомасць. Разам з тым, гэта аб'ект прыроднага асяроддзя. Таму зямля адыгрывае важную ролю як эканамічны рэсурс і разам з тым з'яўляецца экалагічным складальнікам. Гэта дзве вельмі ўзаемазвязаныя рэчы. Ад таго, як мы будзем гаспадарыць на зямлі, будзе залежаць і яе эфектыўнасць. Ад спалучэння двух гэтых фактараў залежыць дабрабыт нашых людзей.

Акрамя таго, зямля з'яўляецца тэрытарыяльным рэсурсам. Усе віды гаспадарчай дзейнасці, пачынаючы з сельскай гаспадаркі і заканчваючы гарадамі, размяшчаюцца на зямлі. І гэта яшчэ адна прычына ашчадна да яе ставіцца. Тым больш, што нагрузкі, антрапагеннае ўздзеянне робяцца ўсё большымі.

Ашчаднае стаўленне да зямлі абумоўленае яшчэ і глабальнымі экалагічнымі зменамі. Сёння чалавецтва мае тры ключавыя экалагічныя праблемы. Першая — захаванне біялагічнай разнастайнасці раслліннага і жывёльнага свету. Другая — змена клімату. Трэцяя глабальная праблема — дэградацыя земляў. Усе тры праблемы планетарнага маштабу, быццам бы асобныя, але ў рэальнасці ўзаемазвязаныя.

Таму ў свой час і былі прынятыя тры прыродаахоўныя канвенцыі ААН, якія датычыліся гэтых праблем. Беларусь падпісала ўсе тры. Сёння надаецца вялікая ўвага іх выкананню. Вось чаму мы ўзяліся распрацаваць мерапрыемствы па барацьбе і прадухіленні дэградацыі земляў.

**— Ці ёсць асаблівасці дэградацыі земляў на Беларусі?**

— Так. Найбольш балючая тэма для нас — дэградацыя тарфянікаў, асабліва — асушаных. Пад сельгасугоддзямі такіх мільён гектараў з дзевяці мільёнаў. Яшчэ адна наша праблема — дэградацыя земляў у выніку здабычы карысных выкапняў, асабліва будаўнічых матэрыялаў, жвірова-пясчаных сумесяў, торфу. Прыкладна 280 тысяч гектараў сёння ў нас выпрацаваных торфараспрацовак. Гэта плошча паўтара сярэдніх адміністрацыйных раёнаў Беларусі. І гэта раны на целе беларускага ландшафту.

А мы ж яшчэ маем развітую хімічную прамысловасць. Два нафтаперапрацоўчыя заводы, азотны завод, цэментную вытворчасць, вялізнае прадпрыемства па здабычы калійных соляў. Прычым, у апошнім выпадку, вытворчасць сканцэнтравана на невялікай плошчы. Так, у свеце існуе шэраг такіх камбінатаў: у Германіі, Канадзе і Чылі. Але яны меншыя па магутнасці, і не ў такой ступені сканцэнтраваныя. Сёння, у выніку здабычы калійнай солі, якая доўжыцца ўжо 50 гадоў, на плошчы ў 5 тысяч гектараў сабралася прыкладна 750 млн тон адходаў. Аднак калі ацэньваць уздзеянне гэтых адходаў на навакольнае асяроддзе, то плошчу гэту трэба памножыць у некалькі разоў.

Калі мы кажам пра транспартныя магістралі, то таксама павінны разумець, што гэта не толькі 80 тысяч кіламетраў дарог з цвёрдым пакрыццём, колькасць якіх расце, альбо 4 працэнты тэрыторыі краіны. Гэта яшчэ прыкладна 3 мільёны аўтамабіляў, кожны з якіх — крыніца забруджвання, у тым ліку і глебы. У Мінску 80 працэнтаў забруджвальнікаў складае аўтамабільны транспарт, і толькі 20 — стацыянарныя крыніцы.

І, безумоўна, вялікая наша трагедыя — наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Мы таксама адносім гэта да працэсаў дэградацыі земляў. Бо забруджванне адбылося доўгатэрміновае, на многія дзясяткі гадоў.

**— Ці няма тут благога без добрага?**



*Балота пасля пажару.*

Фота Генадзя ДУДКО.

***Літаральна на нашых вачах за апошнія 20-30 гадоў зніклі вельмі многія тарфянікі з беларускіх ландшафтаў. Гэта хвалюе не толькі з пазіцыі экалогіі, але з пазіцыі эканомікі: там, дзе раней вырошчваліся сельскагаспадарчыя культуры, сёння — пясок.***

**Чалавек вымушаны быў пакінуць вялікія тэрыторыі, дзе раслінны і жывёльны свет цяпер ад яго не церпіць.**

— Для таго, каб нейтралізаваць наступствы аварыі, мы, зразумела, выкарыстоўваем гэтыя тэрыторыі пад прыродныя экасістэмы, але хацелася б, каб гэта было не такой цаной. Чарнобыльская катастрофа — тэхнагеннае забруджванне, якое накрыла 25 працэнтаў тэрыторыі нашай краіны. Гэта 1,6 млн гектараў сельгасугоддзяў і 1,8 млн гектараў лясоў. 70 працэнтаў радыенуклідаў выпала на Беларусі.

Формаў дэградацыі шмат, і каб спыніць гэты працэс, мы павінны выпрацаваць шэраг мерапрыемстваў. Прычым мерапрыемствы і будуць датычыцца розных сектараў эканомікі, і будуць міжгаліновымі. Патрабуюцца намаганні ўсёй дзяржавы, а не нейкага аднаго міністэрства, ведамства альбо адміністрацыйнага органа. Таму была пастаўлена задача скласці Нацыянальную праграму дзеянняў па барацьбе з дэградацыяй земляў. Дарэчы, гэтага патрабуе і Канвенцыя, якую мы падпісалі.

Гэта стала адной з перадумоў з'яўлення праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы развіцця ААН «Пабудова патэнцыялу ў галіне Стратэгічнай экалагічнай ацэнкі і ў галіне рэалізацыі прыродаахоўных канвенцый у Рэспубліцы Беларусь». Праект падтрыманы міжнароднай супольнасцю, якая дапамагае ў тым ліку і фінансава, бо ён вырашае глабальную задачу. Наша Беларусь — частка Еўропы і свету, а рашэнне экалагічных праблем патрабуе намаганняў як асобных краін, так і ўсяго чалавецтва. Экалагічныя праблемы не маюць нацыянальных межаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

# РАНІЦА НАД БЯРЭЗІНАЙ

Жывая зямля







*З першымі ранішнімі промнямі рака Бярэзіна набывае непаўторны выгляд, але ўсяго на імгненне. Колькі раздолля для вока бачыць яе з вышыні птушынага палёту! Здаецца, бясконца ўзіраўся б у астравы на старых рэчышчах і сасновыя бары, праз якія пятляе наша Бяроза. І не стамляюся паўтараць, што прырода — лепшы мастак!*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

Здароўе на талерцы

# Яблык на вячэру — ніколі не хварэю

## Вялікія і малыя, кіслыя і салодкія, зялёныя і чырвоныя — усе карысныя



**У народнай медыцыне яблыкі здаўна выкарыстоўваюцца для лячэння і прафілактыкі многіх захворванняў. Ужываць іх рэкамендуецца пры кішэчных інфекцыях, хваробах нырак, гіпертаніі, атлусценні, малакроўі, падагры, цукровым дыябеце. Лекавы моц яблыкаў тлумачыцца іх багатым хімічным складам: тут прысутнічаюць вітаміны С, $B_1$, $B_2$, Р, Е, карацін, а таксама цукры, клятчатка, арганічныя кіслоты (яблычная, лімонная, вінная), мікраэлементы (калій, фосфар, магній, жалеза, медзь, хром, цынк і інш.). Лупіна пладоў змяшчае флаваноіды.**

● Два яблыкі ў дзень задавольваюць патрэбу дарослага чалавека ў вітаміне Р. Апошні ўмацоўвае сценкі крывяносных сасудаў, змяншае іх ломкасць і пранікальнасць.

● Цэняць яблыкі і за ўтрыманне вялікай колькасці пекціну. Менавіта сырыя дзёртыя яблыкі — адзін з лепшых сродкаў прафілактыкі запораў. Але ёсць у пекцінаў і яшчэ адна цудоўная ўласцівасць. Яны валодаюць здольнасцю звязваць і выводзіць з арганізма цяжкія металы. Таму яблычная дыета асабліва карысная тым, хто працуе на шкодным вытворчасці. Аднак, каб атрымаць такі лекавы эфект, трэба з'ядаць за дзень не менш як пяць яблыкаў.

● Яблыкі — цудоўны супрацьпрастудны сродак. Пры болях у горле рэкамендуецца змяшаць у роўных прапорцыях кашку з дзёртых яблыкаў з мёдам і прымаць па 2—3 ч. лыжкі 2 разы на дзень. А калі вас мучыць кашаль, прыгатуйце яблычны кампот. Для гэтага 3 неабабраныя яблыкі нарэжце скрылікамі, заліце літрам вады і варыце, пакуль яблыкі не стануць мяккімі. Кампот варта піць цёплым па 2—3 кубкі ў дзень.

● Яблыкі змяншаюць засваенне тлушчаў, аказваюць лёгкі мачагонны эфект, а клятчатка, якая ўтрымліваецца ў іх, выклікае працяглае адчуванне насычэння. Таму гэту садавіну ахвотна ўжываюць людзі, якія хочуць пахудзець ці падтрымаць фігуру.

● Яблыкі адносна нізкакаларыйныя, але багатыя на фруктозу. Яна саладзейшая за цукрозу (звычайны трысняговы цукар), пастунова засвойваецца арганізмам, а значыць, садзейнічае стабілізацыі ўзроўню цукру ў крыві.

● І яшчэ. Яблыкі ачышчаюць зубную эмаль, чым прадухіляюць узнікненне карыесу. Таму аматары яблыкаў, як правіла, маюць моцныя здаровыя зубы.

**Увага!** ***Пры гастрыце з паніжанай кіслотнасцю страўнікавага соку паказаныя яблыкі кісла-салодкіх гатункаў.***

### ЯБЛЫКІ З КАРЫЦАЙ

***Вам спатрэбіцца:*** *5—6 яблыкаў, 0,5 шклянкі смятаны, 1 ч. лыжка цукровай пудры, 1 ч. лыжка цукру, 1 ч. лыжка карыцы, лімонная кіслата на смак.*

У яблыкаў выразаць асяродак і нарэзаць іх кружочкамі па 5—7 мм. Кружочкі выкласці ў неглыбокую каструлю, заліць вадой, дадаць цукар і лімонную кіслату. Варыць да гатоўнасці і астудзіць. Яблыкі выкласці ў пасудзіну, зверху паліць смятанай, пасыпаць цукровай пудрай і карыцай.

### ЯБЛЫЧНЫЯ БУТЭРБРОДЫ

***Вам спатрэбіцца:*** *белы хлеб, яблыкі, 2 яйкі, 0,5 шклянкі цукру.*

Хлеб нарэзаць лустачкамі таўшчынёй 1 см; бялкі ўзбіць, пастунова дадаючы цукар. Яблыкі надзерці на тарцы і выкласці на хлеб. Зверху намазаць узбітымі бялкамі. Выпякаць у духоўцы пры тэмпературы 250 градусаў 10—15 хвілін.

### САЛАТА З МОРКВЫ І ЯБЛЫКАЎ

***Вам спатрэбіцца:*** *3 морквіны, 2 яблыкі, 5 грэцкіх арэхаў, 1 ст. лыжка мёду, палова лімона.*

Моркву і яблыкі надзерці на буйной тарцы, растаўчы ачышчаныя арэхі. Змяшаць усе інгрэдыенты, дадаць мёд, паліць сокам лімона.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

### ПЯЦЬ ХВІЛІН НА РОЗДУМ

В. Фрыгін (Магілёў)



Белыя: Крс3, Фа3, Лg5, Лg1, Kg3 (5)

Чорныя: Kph3, п. c6 (2)

Мат за 2 хады.

В. Фрыгін (Магілёў)



Белыя: Кре1, Ла1, Лh1, Са5, Kg7, Kh5, пп. b4, c4, d5, d7, e6 (11)

Чорныя: Kpd6, Ла8, Лb7, Сс8, пп. c7, e7 (6)

Мат за 3 хады.

Прыводзім дзве задачы Валерыя Фрыгіна. У пачатку жніўня яму споўнілася 60 гадоў. Юбіляр Валерый Фёдаравіч — майстар спорту па рашэнні шахматных кампазіцый, 18-разовы чэмпіён РБ па рашэнні задач і эцюдаў. Бронзавы прызёр 4-га асабістага першынства Беларусі ў раздзелах двуххадовак і эцюдаў. На яго рахунку — больш за 100 кампазіцый, палова з якіх адзначана прызамі і водгукамі. Шмат з іх было апублікавана на старонках нашай газеты.

Пажадаем жа Валерыю Фёдаравічу моцнага здароўя і новых творчых поспехаў!

Чакаем вашых адказаў на задачы юбіляра.

### ПРАВЕРЦЕ ВАШЫ АДКАЗЫ

Змяшчаем рашэнні задач, апублікаваных у газеце за 12 жніўня г.г.

В. Жуковіч. 1 Kpf6? Ка5! 1. е4! ~ 2. Фе6х.

В. Разінкін. 1. Лh4! b6 2. Лh5 b5 3. Лh6х.

1... Kpb5 2. C:b7, 1... Kpb6 2. Лb4+.

1. Са7? Кр:а7! 1. Сс7? b5!

### ПАСПРАБУЙЦЕ СВАЕ СІЛЫ

Маскоўскі Спарткамітэт і камісія па кампазіцыі Масквы аб'явілі традыцыйны конкурс складання задач (колькасць фігур не больш за 15) і эцюдаў (не больш за 10).

Раздзелы і суддзі: двуххадоўкі — Я. Уладзіміраў, трохходоўкі — Ф. Давідэнка, шматходоўкі — А. Сцёпачкін, эцюды — А. Селіванаў, задачы на кааператыўны мат — А. Лобусаў, задачы на зваротны мат — А. Феакцістаў.

Творы, адлюстраваныя на дыяграмах, у 2-х экзэмплярах трэба высылаць да 15.09 г.г. на адрас: 115487, Москва-487, а/я 9, Шумарину Владимиру Павловичу, гл. судье конкурса.

## ОАО «Пивзавод Оливария»

ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «ПИВЗАВОД ОЛИВАРИЯ»,

которое состоится 2 сентября 2009 года в 15.00 в конференц-зале ОАО «Пивзавод Оливария»

по адресу: город Минск, проспект Машерова, дом 19.

Форма проведения внеочередного собрания акционеров – очная.

Повестка дня внеочередного собрания акционеров:

1) О досрочном прекращении полномочий члена Наблюдательного Совета ОАО «Пивзавод Оливария» Йохана Кирстена Браммера.

2) О досрочном прекращении полномочий члена Наблюдательного Совета ОАО «Пивзавод Оливария» Шевки Акунера.

3) Об избрании членов Наблюдательного Совета ОАО «Пивзавод Оливария».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 2 сентября 2009 года, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию на 12 августа 2009 года. Материалы к внеочередному собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» 2 сентября 2009 года будут представлены для ознакомления акционерам с 21 августа 2009 года на информационном стенде в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19.

Регистрация акционеров для участия во внеочередном собрании ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться 2 сентября 2009 года с 13.50 до 14.50 в помещении конференц-зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: г. Минск, проспект Машерова, дом 19. Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

**Наблюдательный Совет.** УНП 100128525.

**Страховые полисы ЗАСО «Белнефтестрах»** по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серия АЖ 6144373—6144400; бланки квитанций о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серия КС 0521686—0521695; страховые свидетельства «Зеленая карта» серия BY/03 3241062, 3245976—3245990 **считать недействительными**.

Минский городской центр недвижимости

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 31 АВГУСТА 2009 ГОДА 90-ГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска

| № лота | Адрес, тип помещения, целевое назначение | Арендуемая площадь, кв. м | Начальная цена, тыс. руб. |
|---|---|---|---|
| | **КУП «ЖРЭО Заводского района г. Минска» тел. 285-56-02** | | |
| 1. | Пр. Партизанский, 89а, помещение в цокольном этаже, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с жильцами дома (под объект по оказанию медицинских услуг, кроме стоматологии) | 75,46 | 3000 |
